**Ляпешкін Яўген Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# МІНСКІЯ ГУБЕРНАТАРЫ: КІРАВАННЕ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Новым этапам у развіцці інстытута губернатарства стала Першая сусветная вайна, якая прывяла да карэкціроўкі паўнамоцтваў губернатараў. У ліпені 1914 г. беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы. Тылавымі раёнамі франтоў сталі Дзвінская і Мінская ваенныя акругі на тэатры ваенных дзеянняў. Таму мясцовая грамадзянская ўлада на тэрыторыі Беларусі перайшла ў падпарадкаванне вайскоўцам, а менавіта – начальнікам Дзвінскай і Мінскай ваенных акруг на тэатры ваенных дзеянняў [2, с. 316; 22, 3, с. 434]. А тыя падпарадкоўваліся начальнікам ваенных зносін адпаведных франтоў.

У ваенны час, як і раней, у абавязкі губернатара ўваходзіла абнародаванне найвышэйшых указаў. Таму па прадстаўленні мінскага губернатара А. Ф. Гірса было апублікавана распараджэнне пра абвяшчэнне губерні з 18 ліпеня 1914 г. на ваенным становішчы [1, с. 19].

Галоўным начальнікам Мінскай ваеннай акругі на тэатры ваенных дзеянняў 19 ліпеня 1914 г. быў прызначаны генерал ад кавалерыі Е. А. Рауш фон Траубенберг. Менавіта ў яго падпарадкаванні і апынуўся дзеючы мінскі губернатар А. Ф. Гірс. Пры гэтым па вертыкалі ўлады ён па-ранейшаму падначальваўся і міністру ўнутраных спраў [2, с. 316, 318].

20 кастрычніка 1915 г. імператар Мікалай ІІ распарадзіўся «вызваліць губернатараў...ад загадвання бягучымі справамі, пакінуўшы за імі агульнае кіраўніцтва кіраваннем губерняй», і ўсклаў на іх «адказны кірунак і аб'яднанне на месцах усіх мерапрыемстваў і дзеянняў, выкліканых умовамі ваеннага часу, а таксама і па барацьбе з дарагоўляй прадметаў першай неабходнасці». У выніку загадванне бягучымі справамі ўскладалася на віцэ-губернатараў [7, арк. 129; 2, с. 318].

У сувязі з чым, 21 лістапада 1915 г. А. Г. Чарняўскі, які кіраваў у гэты час Мінскай губерняй, прасіў віцэ-губернатара М. А. Астаф'ева «вырашаць самастойна і падпісваць за губернатара надалей да адмысловага распараджэння бягучыя перапіскі» па ўсіх падведамасным яму губернскім установам, за некаторымі выключэннямі [7, арк. 129–130].

За перыяд са жніўня 1914 па люты 1917 г. у Мінскай губерні змянілася тры губернатары: А. Ф. Гірс (1912–1915 г.), А. Г. Чарняўскі (1915–1916), А. В. Друцкой-Сакалінскі (1916–1917) [5, с. 80, 117, 271].

Як прызнаваўся В. А. Друцкой-Сакалінскі, ён «быў значна больш вольны ў сваіх дзеяннях, чым любы губернатар у мірны час». Гэта стала магчымым дзякуючы ўстанаўленню прамых кантактаў з галоўным начальнікам забеспячэння Заходняга фронту генералам М. Я. Туманавым. Таму губернатар мог скарыстацца не толькі сваімі звычайнымі паўнамоцтвамі, але і надзвычайнымі правамі вайскоўцаў пад час вайны [4, с. 120]. Да такога спосабу кіравання В. А. Друцкой-Сакалінскі часта звяртаўся на практыцы.

Напрыклад, у ходзе спецыяльнага расследавання, праведзенага ў Бабруйску, мінскі губернатар даведаўся пра тое, што мясцовая паліцыя за

хабар дазваляла яўрэям праводзіць незаконныя гандлёвыя аперацыі са спіртам. Таму У. А. Друцкой-Сакалінскі звольніў са службы ўсіх класных чыноў, прыставаў і іх памочнікаў, а бабруйскага паліцмайстра саслаў у Сібір. У апошнім выпадку губернатар дзейнічаў ад імя галоўнага начальніка забеспячэння Заходняга фронту. Калі мінскі губернатар далажыў аб гэтым М. Е. Туманаву, той ухваліў разгром злачыннай арганізацыі [4, с. 126–128]. Такім чынам, мінскі губернатар рэальна выкарыстоўваў надзвычайныя паўнамоцтвы вайскоўцаў для вырашэння пытанняў кіравання ў падведамаснай губерні.

Што тычыцца тэхнічнага боку ўзаемаадносін ваеннага і грамадзянскага кіраўніцтва, то ён у ваенны час выглядаў наступным чынам. Паведамленні паміж штабам ваеннай акругі і канцылярыяй губернатара перадаваў кур’ер. Або начальнік ваеннай акругі ці начальнік яго штаба тэлеграмай адпраўлялі губернатару прадпісанні. Апошні распаўсюджваў іх у губерні праз сваіх падначаленых і сачыў за дакладным выкананнем [2, с. 316–317].

Так, галоўнакамандуючы войскамі, генерал-ад’ютант А. Е. Эверт 31 жніўня 1916 г. выдаў абавязковую пастанову для мясцовасцей, размешчаных у раёне Заходняга фронту. Забаранялася вывозіць з раёна фронту перавозачныя сродкі. Вінаватых у парушэнні гэтай пастановы чакаў грашовы штраф або арышт. Губернатары ўпаўнаважваліся весці справы, якія маглі ўзнікаць з нагоды невыканання дадзенай пастановы. 11 верасня 1916 г. канцылярыя губернатара пасылае у мінскую губернскую па земскім і гарадскім справах прысутнасць 3 асобнікі гэтай пастановы [6, арк. 141–143].

Начальнік губерні выступаў ключавым звяном і ў адваротных зносінах паміж насельніцтвам і ваенным кіраўніцтвам. Калі дзеянні вайскоўцаў выклікалі незадаволенасць мясцовых жыхароў, губернатар для вырашэння праблемы звяртаўся да начальніка ваеннай акругі [2, с. 317].

Разам з тым губернатары імкнуліся захоўваць паўнату ўлады адносна чыноў, якія павінны былі ім падпарадкоўвацца. У загадзе ад 31 сакавіка 1916 г. начальнік Мінскай губерні А. Г. Чарняўскі выказваў відавочнае незадавальненне ініцыятыўнасцю падначаленых: «некаторыя з падведамасных мне службовых асоб…дазваляюць сабе непасрэдныя яўкі, па сваёй ініцыятыве, да вышэйшых ваенных улад у гор. Мінску, без майго ведама, для высвятлення розных пытанняў грамадзянскага кіравання». Таму губернатар забараніў падобнае самавольства і патрабаваў атрымліваць у яго дазвол, за выключэннем выпадкаў, калі «само ваеннае начальства выкліча тую ці іншую службовую асобу» [6, арк. 26].

Для вышэйшага начальства пад час вайны губернатары заставаліся асноўнымі інфарматарамі. Міністр унутраных спраў даручыў Дэпартаменту агульных спраў прыступіць да распрацоўкі законапраекта па пытанню аб дазваленні правоў дзяржаўнай службы асобам жаночага полу па МУС. У сувязі з чым 11 чэрвеня 1916 г. Дэпартамент агульных спраў цыркулярна прасіў губернатараў, начальнікаў абласцей і градаўначальнікаў паведаміць патрэбныя звесткі у Дэпартамент. Таксама губернатараў прасілі падаць заключэнні, якія яны прызнаюць патрэбнымі для найлепшага асвятлення гэтага пытання [6, арк. 74]. Такім чынам, МУС патрабавала ад губернатараў не толькі канкрэтныя дадзеныя, але цікавілася і іх уласным меркаваннем.

У выніку Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. дзеючыя губернатары былі пазбаўлены ўлады. Пастановай Часовага ўрада ад 4 сакавіка 1917 г.

загадвалася ўсім губернатарам пакінуць свае пасады. Іх абавязкі часова ўскладаліся на прадстаўнікоў губернскіх земскіх упраў, якія атрымалі назву «губернскіх камісараў Часовага ўрада» [8, с. 422]. Не маючы рычагоў супрацiву, начальнікі губерняў вымушаны былі здаць пасты.

Такім чынам, пад час першай сусветнай вайны ў Мінскай губерні змянілася тры губернатары. Яны падпарадкоўваліся акрамя міністра ўнутраных спраў ваенным начальнікам, прычым кантакты з апошнімі мелі больш істотнае значэнне. Начальнікі губерняў у сваім кіраванні выкарыстоўвалі надзвычайныя паўнамоцтвы вайскоўцаў. Губернатар выступаў ключавым звяном у ажыццяўленні зносін паміж ваенным начальствам і грамадзянскім насельніцтвам.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Беларусь в годы Первой мировой войны (1914–1918): сб. документов / сост. В.В. Врублевский [и др.]; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2014. – 356 с.
2. Бригадин, П.И. Минские губернаторы: история власти / П.И. Бригадин, А.М. Лукашевич. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Соврем. шк.: Экоперспектива, 2007–2011. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2007. – 519 с.
4. Друцкой-Соколинский, В.А., князь. На службе Отечеству. Записки рус. губернатора (1914–1918 гг.) / В.А. Друцкой-Соколинский; сост. А.В. Воробьев; ред. А.В. Богданчиков. – Орел: РКФ «3 июля»: РИГ «Невероятный мир», 1994. – 405 с., 2 л. ил.
5. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю.Н. Снапковский; редкол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2016. – 398 с., [2] л.: ил.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 22. Воп. 1. Спр. 1286. Приказы Главнокомандующего Западным фронтом; обязательные постановления командующих армиями для населения, циркулряры МВД, МТП, Главного управления сельского хозяйства, минского губернатора об учете сырья и продовольствия, установлении такс на продукты питания, учете и запрещении вывоза перевозочных средств и др. 02.01.1916–13.01.1917.
7. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 7. Спр. 530. Дело о службе Минского вице-губернатора коллежского советника Н.А. Астафьева. 17.03.1915–14.01.1917.
8. Революционное движение в России после свержения самодержавия / редкол.: Л.С. Гапоненко (отв. ред.) [и др.]. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1957. – XXIV, 857 с. – (Великая Октябрьская соц. революция. Документы и материалы / редкол.: А.Л. Сидоров (пред.) [и др.] / Акад. наук СССР. Ин-т истории. Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. Глав. архивное упр. СССР).



**Малиновская Эмма Леонидовна**

*Музей истории Белорусского государственного университета (Минск, Беларусь)*


# ОСНОВНЫЕ МЕТОДЫ ФОРМИРОВАНИЯ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ БССР В 1920-1930-х гг.

Одним из масштабных методов формирования интеллигенции БССР выступал комплекс мероприятий репрессивной политики советского государства. Она имела огромные социально-психологические последствия, как в 1930-е гг., так и в последующем времени. Посредством данной политики была осуществлена унификация и стандартизация